*УДК 2164*

# СИСТЕМА ЛИТЕРАТУРНОГО ФАКТА: КРИТИЧЕСКОЕ МНЕНИЕ КАК НЕОТЪЕМЛЕМЫЙ ЕЕ КОМПОНЕНТ

***А. Н. КОВАЛЕВСКИЙ*** [1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассматриваются вопросы прочтения критиком художественного произведения и комплексная оценка творчества писателя, которые относятся не только к авторскому произведению или творчеству, но также и к иным критическим текстам, посвященным данным объектам исследования. Таким образом, литературное произведение, критически осмысленное и соотнесенное с многочисленными репликами-мнениями о нем, преобразуется в литературный факт, в диалог между писателем и публикой.

***Ключевые слова:*** критика; литература; поэзия; литературный факт; мнение; диалог; текст; творчество; писатель; реплика; интерпретация; оценка; научность; экспрессивность.

# СІСТЭМА ЛІТАРАТУРНАГА ФАКТА: КРЫТЫЧНАЕ МЕРКАВАННЕ ЯК НЕАД'ЕМНЫ ЯЕ КАМПАНЕНТ

***А. М. КАВАЛЕЎСКІ*** [1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск Беларусь*

Разглядаюцца пытанні прачытання крытыкам твора і комплексная ацэнка творчасці пісьменніка, якія тычацца не толькі аўтарскіх твора або творчасці, але таксама і іншых крытычных тэкстаў, прысвечаных дадзеным аб’ектам даследавання. Такім чынам, літаратурны твор, крытычна асэнсаваны і суаднесены са шматлікімі рэплікамі-меркаваннямі пра яго, ператвараецца ў літаратурны факт, гэта значыць у дыялог паміж творцам і публікай.

***Ключавыя словы:*** крытыка; літаратура; паэзія; літаратурны факт; меркаванне; дыялог; тэкст; творчасць; пісьменнік; рэпліка; інтэрпрэтацыя; ацэнка; навуковасць; экспрэсіўнасць.

**Образец цитирования:**
Кавалеўскі АМ. Сістэма літаратурнага факта: крытычнае меркаванне як неад’емны яе кампанент. *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика*. 2019;1:102–107.

**For citation:**
Kavaleuski AM. The system of literary fact: critical opinion as its integral component. *Journal of the Belarusian State University. Journalism and Pedagogics.* 2019;1:102–107. Belarusian.

**Автор:**
***Артем Николаевич Ковалевский*** – старший преподаватель кафедры литературно-художественной критики факультета журналистики.

**Author:**
***Artsiom M. Kavaleuski***, senior lecturer at the department of literary-art criticism, faculty of journalism.
*rybaart@yahoo.com*

# THE SYSTEM OF LITERARY FACT: CRITICAL OPINION AS ITS INTEGRAL COMPONENT

***A. M. KAVALEUSKI*** [a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article deals with the questions of the critic's reading of a work of art and a comprehensive assessment of the writer's creativity, which relate not only to the author's work or creativity, but also to other critical texts devoted to these objects of research. Thus, a literary work, critically meaningful and correlated with numerous replicas-opinions about it, is transformed into a literary fact, into a dialogue between the writer and the public.

***Key words:*** criticism; literature; poetry; literary fact; opinion; dialogue; text; creativity; writer; replica; interpretation; evaluation; scientific; expressiveness.

У дыскусіях апошніх дзесяцігоддзяў, прысвечаных праблеме ўзаемадзеяння (і ўзаемаадасаблення) літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства, адрозненню іх аб'екта і спосабаў даследавання, вельмі часта прысутнічае строгі падзел, паводле якога пазнавальная праца над сістэмным даследаваннем літаратурнага твора замацоўваецца за навукоўцамі, а крытыкам адводзіцца дапаможная, другасная роля «вольных інтэрпрэтатараў», якая абапіраецца на такія адносна-абстрактныя паняцці, як «уражанне», «імпрэсія», «суб'ектывізм», «ацэначнасць» і ім падобныя. Але ўсё ж цяжка не пагадзіцца з меркаваннем аб спецыфічнай прыродзе крытычнага выказвання. Літаратурная крытыка сапраўды спалучае ў сабе элементы навуковасці і мастацкасці. І мастацкія ўласцівасці характэрны для яе не толькі па прычыне ўздзеяння мастацтва слова, з якім яна мае справу. Гэтыя ўласцівасці выступаюць звычайна і ў абагульненых крытычных разважаннях, не звязаных з канкрэтнымі творамі. Экспрэсіўнасць, вобразнасць, індывідуалізаванасць стылю характэрны так ці інакш для ўсіх відаў і форм крытыкі. Уздзеянне мастацкасці саміх літаратурных твораў (калі крытык іх разглядае) паўстае ўжо як свайго роду дадатковая якасць. Разам з тым крытыка, безумоўна, глыбока своеасаблівы від публіцыстыкі, што абумоўлена ўжо хаця б прынцыповай своеасаблівасцю мастацтва слова ў шэрагу іншых грамадскіх з'яў. Мастак стварае твор, а крытыка ўключае, уводзіць гэты твор у сістэму літаратуры, дзе ён набывае свой сучасны сэнс і пачынае адыгрываць сваю грамадскую ролю. Не абвяргаючы меркавання аб тым, што крытыка, маючы шмат агульнага і сумежнага з літаратуразнаўствам, з'яўляецца ўсё ж незалежнай і спецыфічнай галіной творчай дзейнасці і не адносіцца цалкам ні да мастацтва, ні да навукі, ні да публіцыстыкі (хоць і мае з імі шмат агульнага), хацелася б, аднак, падкрэсліць і больш падрабязна спыніцца менавіта на пазнавальнай функцыі крытыкі ў дачыненні да мастацкага твора. Больш за тое, крытыка з'яўляецца не толькі словам аб літаратуры, але і камплементарным элементам самой літаратуры, які часам існуе на тым жа самым узроўні, што і пісьменніцкая дзейнасць. Здараецца, што ў пэўнай ступені крытыка выступае замест літаратуры, сублімуе яе, калі, напрыклад, згадвае ці ўзнаўляе вартасці, тэмы і праблемы, якія па тых ці іншых прычынах не былі належным чынам (або ўвогуле) актуалізаваны пісьменніцкай творчасцю; калі вышуквае і тлумачыць раней не заўважаныя зместы, на якіх літаратура не змагла або не захацела спыніць сваю ўвагу. У гэтым сэнсе крытыка ёсць сама літаратура, праўда з іншым станам і аб'ектам засяроджанасці.

Калі пісьменнік стварае мастацкі твор, то крытыка ўключае, уводзіць яго ў сістэму літаратуры, яе агульнагістарычны кантэкст. З іншага боку, не варта забываць і пра той аспект крытыкі, што звязаны з яе «пазалітаратурнай» стратэгіяй, – ролю пасрэдніка паміж творцам і чытачом, якая ў значнай ступені стабілізуе сістэму літаратурнай культуры, фарміруе веды, густ, кампетэнцыю і духоўна-эстэтычны вопыт грамадства. Але, нягледзячы на ўсе магчымыя вонкавыя фактары, крытыка ў першую чаргу з'яўляецца істотна важнай і неабходнай дысцыплінай для пазнання і спасціжэння менавіта літаратурнага *твора*. У даследаванні літаратурнага працэсу ёсць шэраг іншых знамянальных аб'ектаў: тэорыя літаратуры, псіхалогія творчасці, біяграфія аўтара і інш. Аднак галоўны ў літаратурным жыцці, безумоўна, твор. Менавіта ён (у вузкім сэнсе) з'яўляецца літаратурай і надае літаратурны характар усяму таму, што з ім так ці інакш звязана. У гэтым сэнсе крытычнае выказванне прадстаўляе сабой лагічны працяг выказвання мастацкага.

Калі гаворка ідзе пра крытычнае пазнанне літаратурнага твора, важна вызначыць спецыфіку самога пазнання: калі яно мае навуковы характар, то служыць мэтам выключна навуковым, калі крытычны – то, адпаведна, крытычным. Навуковае даследаванне твора, як паказвае вопыт, можа ісці ў асноўным у трох напрамках. Першы напрамак звязаны з класіфікацыяй, калі мастацкі твор у залежнасці ад яго іманентных уласцівасцей заліч-

ваецца да той ці іншай групы (у шырокім сэнсе – літаратурная эпоха, плынь, школа, жанр) і даследуецца згодна з яе характэрнымі рысамі.

Як правіла, гэты напрамак знаходзіць свой лагічны працяг у другім, больш складаным, які займаецца пошукам прычынных сувязей, або уплываў. Гэта могуць быць уплывы, якія дадзены твор аказаў на іншыя творы або на бягучы літаратурны працэс. Часцей, аднак, даследчыцкая практыка імкнецца высветліць, пад якім уплывам узнік той канкрэтны твор, які абраны аб'ектам вывучэння. Тут бяруцца пад увагу розныя фактары, як знешнія (біяграфія аўтара, яго светапогляд, культурна-грамадскае асяроддзе, эстэтычны вопыт), так і ўнутраныя, якія непасрэдна характарызуюць твор як мастацкую сістэму (запазычанні, цытаты, алюзіі, рэмінісцэнцыі). Усе гэтыя метады вядомы пад назвай генетычных і прэтэндуюць на навуковасць дзякуючы высвятленню прычын той ці іншай з'явы ў літаратуры.

Трэці напрамак даследавання прадугледжвае падрабязны комплексны аналіз (які ўлічвае як знешнія, так і ўнутраныя бакі існавання твора), ён спрыяе найбольш поўнаму і грунтоўнаму разуменню характэрных рыс і ўласцівасцей мастацкага тэксту. З узгаданых напрамкаў толькі трэці з'яўляецца найбольш універсальным, бо менавіта з яго дапамогай ажыццяўляецца сапраўднае пазнанне і спасціжэнне літаратурнага твора як мастацкай з'явы. Класіфікацыя і ўстаноўка прычынных сувязей (уплываў) – гэта ў пэўным сэнсе толькі сродкі на шляху да аналізу як да асноўнай мэты даследавання, самі па сабе, ізалявана, яны прыводзяць толькі да частковага пазнання або вядуць да спасціжэння другасных з'яў, якія з творам звязаны толькі апасродкавана.

Не з'яўляючыся навукай (але выкарыстоўваючы пэўныя яе механізмы і сродкі), літаратурная крытыка, тым не менш, здольна ажыццяўляць паўнавартасны аналіз (што, зрэшты, і ёсць адна з асноўных яе задач) і весці да сапраўднага пазнання літаратурнага твора, яго сутнаснага спасціжэння. У гэтым ёй спрыяюць такія спецыфічныя ўласцівасці, як ацэначнасць меркавання, канцэнтрацыя на найбольш адметных рысах твора, тонкае пачуццёвае рэагаванне, метафарычнае мысленне, чаго навука фактычна пазбаўлена. Крытычны аналіз адрозніваецца павышаным узроўнем варыятыўнасці, ён больш «пластычны» ў параўнанні з навуковым і менш дыстанцыраваны ў адносінах да чытача, бо сам крытык – гэта перш за ўсё ўдумлівы і ўважлівы чытач, узброены добрым веданнем прадмета даследавання і дасканалым густам. Веданне чытацкай псіхалогіі і спецыфікі ўспрымання літаратурнага твора чытачом – абавязковая ўмова якаснага крытычнага аналізу. Сувязь крытыка з чытачом больш моцная і трывалая, чым сувязь чытача з навукоўцам. Менавіта гэта забяспечвае «адухоўленасць» крытычнага меркавання, яго спецыфічную (не абстрактную) мэтанакіраванасць і досыць высокую ступень мысліцельнай «разняволенасці». Выказванне крытыка ці аўтара пра твор мае значнасць не толькі само па сабе як паказальнік індывідуальнага разумення праблемы, але (што, безумоўна, больш важна) яно выступае як адна з цэлага комплексу магчымых чытацкіх рэплік пра твор. Пры гэтым рэпліка крытыка заўсёды больш разгорнутая, дасканала аформленая, што пераводзіць яе ў катэгорыю асэнсаванага ацэначнага меркавання; у гэтай сітуацыі крытык з'яўляецца не толькі пасрэднікам паміж творам і чытачом, але і правамоцным абаронцам інтарэсаў пэўнага чытацкага асяроддзя.

Прачытанне крытыкам твора ці комплексная ацэнка творчасці пісьменніка тычацца не толькі аўтарскіх твора або творчасці, але таксама і іншых крытычных тэкстаў, прысвечаных дадзеным аб'ектам даследавання. Такім чынам, літаратурны твор, крытычна асэнсаваны і суаднесены са шматлікімі рэплікамі-меркаваннямі пра яго, ператвараецца ў *літаратурны факт*, гэта значыць у дыялог паміж творцам і публікай. Прычым меркаванне крытыка, увасобленае ў створаным ім тэксце, з'яўляецца важным і неад'емным элементам гэтага літаратурнага факта. Дадзенае паняцце (неабходнае ў працэсе разважання над месцам твора ў гісторыка-літаратурным працэсе) уяўляе сабой (у самым абагульненым выглядзе) адзінства, якое складаецца з літаратурнага твора і яго *інтэрпрэтацыйнай мадэлі* ў канкрэтных сацыяльна-літаратурных абставінах. У абагульненай форме літаратурны факт паўстае як двухэлементная сістэма: твор і пасіўнае меркаванне аб ім таго ці іншага чытацкага асяроддзя. Такая спрошчаная сістэма аказваецца пазбаўлена дынамікі, якую здольна прыўнесці толькі крытычнае выказванне.

З'яўленне хаця б аднаго крытычнага выказвання аб творы ператварае літаратурны факт у трохэлементную дынамічную сістэму: паміж творам і пасіўным аб ім меркаваннем паўстае меркаванне, вербальна аформленае, – увасобленае ў апублікаваным тэксце крытыка сведчанне асэнсаванага прачытання твора, прычым гэта сведчанне амбівалентнае, бо яно накіравана як на сам твор, так і на чытацкае ўражанне аб ім. Складанасць і развітасць структуры літаратурнага факта наўпрост залежаць ад колькасці крытычных выказванняў аб творы. У найбольш разгорнутым выглядзе літаратурны факт мае характар прасторы з трыма асноўнымі сферамі засяроджанасці: цэнтральную пазіцыю займае сам твор, вакол яго групуюцца і функцыянуюць крытычныя выказванні, якія з'яўляюцца ацэначнымі рэплікамі на мастацкі твор. Такі комплекс рэплік уяўляе сабой найбольш натуральную сукупнасць крытычных выказванняў розных крытыкаў наконт аднаго твора. Трэцюю (вонкавую) сферу складае ўвесь комплекс пасіўных чытацкіх меркаванняў пра

твор. Структуру літаратурнага факта можна таксама акрэсліць як сукупнасць міжтэкставых рэляцый, гэта значыць узаемаадносін паміж асобнымі крытычнымі выказваннямі і творам, крытычнымі выказваннямі ў межах комплексу рэплік (маецца на ўвазе іх дыялог), крытычнымі выказваннямі і пасіўнымі чытацкімі меркаваннямі, чытацкімі пасіўнымі выказваннямі і літаратурным творам.

Можна таксама назваць дзве асноўныя катэгорыі тэкстаў, якія ўтвараюць літаратурны факт: мастацкі тэкст і тэкст, створаны крытыкам, з'яўляюцца актуальным бокам існавання літаратурнага факта ў той час, калі тэкст гіпатэтычны, *ненапісаны*, суб'ект якога – асяроддзе рэцыпіентаў, можна акрэсліць як патэнцыяльны бок існавання літаратурнага факта, які паўстае як прадмет стыхійнай чытацкай рэканструкцыі. Калі казаць пра ўплыў літаратурна-мастацкай крытыкі на бягучы літаратурны працэс, з аднаго боку, і на гісторыка-літаратурны працэс – з іншага, трэба прызнаць, што твор «сам у сабе», ізалявана, з'яўляецца толькі элементам гэтых працэсаў, у той час калі структураваная прастора літаратурнага факта, у цэнтры якой знаходзіцца твор, уяўляе сабой аснову і прымае актыўны ўдзел у фарміраванні і развіцці як літаратурнага, так і гісторыка-літаратурнага працэсу.

З пункта гледжання асваення чытачом прасторы літаратурна-крытычнага твора варта адзначыць, што ў гэтай перспектыве ён з'яўляецца актуалізацыяй «звышусведамлення» аўтарскага тэксту або асобы аўтара; крытык мае права (і нават павінен) уявіць некаторыя перадумовы ўзнікнення мастацкага тэксту, спецыфіку аўтарскіх вымыслу і задумы, вербалізаваць уяўнае становішча так званага ідэальнага аўтара, які добра ўсведамляе межы свайго твора і здольнасць толькі частковай рэалізацыі яго патэнцыяльна-ўніверсальных магчымасцей (мастацкіх, ідэйных, маральных, сацыяльных і інш.). Для інтэрпрэтацыі твора важнае значэнне маюць яго творчая гісторыя, сам акт стварэння, працэс напісання і ўсе яго аспекты: псіхалагічныя (стан духу паэта, яго творчыя перажыванні), тэксталагічныя (варыянты твора, зафіксаваныя ў чарнавіках), храналагічныя (час напісання твора), жыццёвыя (агульныя акалічнасці працы) і г. д. Усе гэтыя фактары творчай гісторыі могуць быць важнымі для глыбокага прачытання твора. Тэксталагічная гісторыя – адзін з важных момантаў творчай гісторыі твора. З дапамогай параўнання варыянтаў, разгляду чарнавікоў і падрыхтоўчых запісаў даследчык устанаўлівае кірунак развіцця мастацкай думкі аўтара і ператварае ўсе гэтыя матэрыялы і параўнанні ў сродак прачытання і інтэрпрэтацыі твора.

У гэтым выпадку крытык аналізуе і даследуе не толькі тое, што аўтар абраў за аб'ект свайго эстэтычна-духоўнага спасціжэння і прапанаваў у творы, але і тое, ад чаго, магчыма, прыйшлося адмовіцца дзеля дасягнення пастаўленай мастацкай мэты. Такі спосаб узаемадзеяння крытыка з аўтарскім тэкстам адрозніваецца больш высокім узроўнем аналітычнага мыслення і прадугледжвае не толькі інтуітыўнае ўменне адчуваць, пражываць мастацкі тэкст, але і дасканалае веданне гісторыка-літаратурнага працэсу, асноў паэтыкі і вершазнаўства, бо, каб узнавіць і паказаць патэнцыяльную сферу, з якой паўстаў той ці іншы твор, неабходна адчуць сябе і творцам, і даследчыкам адначасова. Гэта яшчэ адзін з момантаў праяўлення спецыфічнай прыроды літаратурнай крытыкі, якая арганічна спалучае рысы мастацкасці і навукі.

З'яўленне новага літаратурнага твора заўсёды прадугледжвае амаль адначасовую магчымасць з'яўлення крытычных меркаванняў аб ім, якія выступаюць у якасці інфарматыўных адказаў і забяспечваюць уключэнне канкрэтнага твора ў сістэму бягучага літаратурнага працэсу. Новы мастацкі твор здольны актывізаваць прастору свайго прачытання і пазнейшых вытлумачэнняў, якія (калі гэта вытлумачэнні крытычныя) самі з'яўляюцца тэкстамі і існуюць у якасці аўтарскай персаніфікацыі крытыка праз спасціжэнне прасторы мастацкага тэксту. Як ужо падкрэслівалася вышэй, такая прастора прачытання ўяўляе сабой літаратурны факт, які пачынае сваё існаванне з моманту ўзнікнення і далейшай актуалізацыі мастацкага твора шляхам усвядомленай яго апрабацыі. Але трэба таксама ўлічваць наяўнасць яшчэ адной немалаважнай камплементарнай у дачыненні да прасторы літаратурнага факта сферы, непасрэдна звязанай з творам, у межах якой змяшчаецца ўся сума інфармацыі пра яго, як рэальнай, так і магчымай, гіпатэтычнай. Гэта сфера вызначае поле альтэрнатыўнага жыцця мастацкага твора і дае магчымасць для бясконцай колькасці прачытанняў, якія будуць базіравацца ўжо не толькі на патэнцыяльных эстэтычных магчымасцях твора, прысутных у ім іманентна, але і на ўжо існуючых ацэнках і меркаваннях, якія ў дадзеным выпадку можна разглядаць як першаэлементы і першапрычыны складанай інтэрпрэтацыйнай сістэмы. Такім чынам, твор пацвярджае сваю мастацкую ўніверсальнасць і першапачатковую апрыорную шматзначнасць. Гэты спосаб яго існавання ўплывае і на два варыянты інтэрпрэтацыі: першы – з пункта гледжання аўтарскай задумы і псіхалогіі спасціжэння рэчаіснасці, другі – з пункта гледжання непасрэднага чытацкага ўспрымання; прычым апошні варыянт уяўляецца больш прадуктыўным у дачыненні да крытычнага выказвання па прычыне той асаблівай увагі, якая ў ім адводзіцца рэцыпіенту, бо ў рэшце рэшт і мастацкі твор, і твор крытычны адрасаваны менавіта чытачу.

Для пісьменніка літаратурны твор мае перш за ўсё суб'ектыўны сэнс: ён з'яўляецца рэалізацыяй пэўнага творчага праекта, задумы або (у больш шырокім сэнсе) артыкуляцыяй яго суб'ектыўнасці. Аднак з пункта гледжання чытача літаратурны твор

мае аб'ектыўны сэнс, а значыць выступае ў якасці аб'екта, прызначанага для спасціжэння і вытлумачэння. Можна лічыць, што крытык займае такое палажэнне адносна літаратурнага твора, якое займае мастак слова адносна самой рэчаіснасці, якую імкнецца спасцігнуць сваімі творчымі намаганнямі і мадэль якой рэалізуе ў творы. Для крытыка важнай і актуальнай робіцца другасная, тэкставая рэчаіснасць аўтарскага твора, у якой рэальны і мастацкі свет аб'ядноўваюцца ў маналітнае адзінства, паводзяць сябе сінкрэтычна. Паколькі мастак мае ў сваім распараджэнні ўсю бязмежнасць праяў навакольнага і ўнутранага свету, крытык з пазіцый эстэтычнага каментарыя ў сваёй творчасці аперыруе толькі адбіткам, праекцыяй аўтарскага светабачання. Задача мастака больш складаная і высокая, што, безумоўна, павышае ступень адказнасці крытыка, які павінен адэкватна прааналізаваць мастацкі твор, падкрэсліўшы і адцяніўшы ўсе без выключэння вартасці (а ў некаторых выпадках і пралікі) аўтарскай рэалізацыі. Чым больш адпаведным (у самым шырокім значэнні слова) будзе эстэтычны і інтэлектуальны кругагляд крытыка творчаму кругагляду мастака, тым больш каштоўным і глыбокім будзе крытычны аналіз. Пры гэтым крытык павінен звяртацца не толькі да свайго ўнутранага голасу і высноў, падказаных веданнем матэрыялу даследавання і бездакорным густам, але і да сістэмы агульнагуманітарных ведаў па эстэтыцы, філасофіі, культуралогіі і інш. Аднак цалкам ідэнтычных спосабаў спасціжэння таго ці іншага аб'екта не існуе, таму прыходзіцца канстатаваць, што крытык ніколі не здолее цалкам вычарпаць і спазнаць таямніцу сапраўды вялікага твора і творцы, як, зрэшты, і сам творца ніколі не спасцігне да канца таямніцу жыцця і рэчаіснасці. Гэты факт зусім не змяншае здольнасці і прызначэння ні літаратара, ні крытыка, бо катэгорыя эстэтычнай недасягальнасці (непасрэдна звязаная з філасофскім паняццем абсалюту, ідэалу) сведчыць пра наяўнасць перманентнай крэатыўнасці ў індывідууме.

Відавочна, што і крытык, і літаратар павінны валодаць выключнай духоўнай індывідуальнасцю, якую мусяць рэалізаваць з дапамогай адмысловых, толькі ім уласцівых спосабаў у сваіх творах. Такім чынам, суб'ектывізм – неабходны рухаючы фактар творчага самавыяўлення, гэта неаспрэчны факт. Але фактам з'яўляецца і тое, што ў крытыцы суб'ектывізм, уяўляючы надзвычай важны элемент індывідуальнасці даследчыка, не можа, аднак, прэтэндаваць на абсалютную ўніверсальнасць. Парадаксальнасць крытычнага меркавання заключаецца ў тым, што яго сапраўдная аб'ектыўнасць дасягаецца шляхам узмацнення суб'ектыўнай актыўнасці крытыка, а змястоўная каштоўнасць меркавання ва ўсіх без выключэння выпадках вымяраецца, з аднаго боку, яго адпаведнасцю эстэтычнаму аб'екту, з іншага – індывідуальнай творчай арыгінальнасцю думкі і формы, у якой увасабляецца гэта думка.

Калі прыняць думку, што выключны суб'ектывізм і нават суб'ектацэнтрызм крытычнага выказвання грунтуюцца ў першую чаргу на павышанай засяроджанасці даследчыка на ўласных індывідуальных рысах успрымання і няздольны поўнамаштабна адкрыць, патлумачыць усе асаблівасці і ўласцівасці мастацкага твора, які таксама можа ацэньвацца і аналізавацца з пункта гледжання чыста аб'ектыўных фактараў (а кожны мастак слова выражае нават самыя арыгінальныя свае творчыя ідэі пры дапамозе гатовых вербальных сродкаў, падвяргаючы іх толькі пэўным, больш ці менш глыбокім мадыфікацыям), то можна падумаць, што вывучаць і ацэньваць мастацкі тэкст мэтазгодна паводле чыста тэхнічных прынцыпаў, кантралюючы і фіксуючы ўплыў слоўнага матэрыялу на форму, ацэньваючы пры гэтым камбінацыі гукаў, выразаў, рытарычных фігур і іншых канструктыўна значных частак тэксту. Неабходна таксама даследаваць этычны або грамадскі бок паэтычнай творчасці, разважаючы над тымі вынікамі, да якіх свядома (ці несвядома) дайшоў паэт у працэсе мастацкага засваення рэчаіснасці. Можна, а нават і трэба, параўноўваць канкрэтны твор з папярэднімі працамі аўтара, каб выявіць некаторыя фазы, тэндэнцыі яго ўнутранага развіцця і творчай эвалюцыі. Цікавыя вынікі дае параўнанне і супастаўленне канкрэтнага твора паэзіі з паэтычнай спадчынай мінулых стагоддзяў, а таксама з працамі сучаснікаў, якія абралі ў сваёй творчасці аналагічную праблематыку, тэматыку, падобны спосаб арганізацыі тэксту. Акрамя гэтага, крытык можа прасачыць эвалюцыю пэўнай формы, ідэі, жанру ў кантэксце гістарычных часу і прасторы, акцэнтуючы ўвагу на адлюстраванні той ці іншай эпохі, літаратурна-мастацкай дактрыны, літаратурнай плыні (школы) у канкрэтным творы. Аднак усе вышэйадзначаныя метады даследавання мастацкага твора разглядаюць яго не як самастойны арганізм, а як частку цэлага, якое мае свае ўласныя спосабы і мэты існавання. Пры гэтым мастацкая вартасць твора (яго ўласна эстэтычны бок), паводле дадзеных метадаў, не можа вызначацца крытыкам суб'ектыўна, а толькі праз эвалюцыйна-грамадскія, маральныя, цывілізацыйныя і іншыя (аб'ектыўныя) рэляцыі.

Відавочна, што дадзеныя падыходы да вывучэння і аналізу мастацкага (а тым больш паэтычнага) твора выглядаюць досыць спрошчанымі і штучнымі (калі бяруцца адасоблена, самі па сабе) і не дазваляюць эстэтычна, комплексна спасцігнуць тонка арганізаваную сутнасць паэзіі, бо ўласна паэтычнае выносіцца імі нібыта на другі план. Для падыходаў, якія абсалютызуюць аб'ектыўны пачатак сваіх даследаванняў, характэрнай рысай з'яўляецца ўпэўненасць у рэчаіснасці, што існуе і развіваецца адасоблена ад слова (а значыць і ад літаратурнага

твора), здольнага толькі больш ці менш удала адлюстроўваць і каментаваць працэсы яе якасных змен. Адпаведна вывучэнне і даследаванне мастацкага тэксту не могуць праводзіцца самастойна, бо ён, згодна з вышэйакрэсленымі прынцыпамі, з'яўляецца выключна часткай аб'ектыўнай рэальнасці, пры дапамозе якой пазнаецца і тлумачыцца.

Можна дапусціць, што межы суб'ектывізму ў крытыцы заканчваюцца там, дзе заканчваецца аналіз, у якім дамінуюць чыста эстэтычныя прынцыпы разгляду мастацкага твора, і пачынаецца аналіз з навуковых або маральных пазіцый. Аднак, калі крытык перастане арыентавацца на такія аспекты эстэтычнага ўспрымання, як густ, унутранае перажыванне, суперажыванне, і пакіне ацэнку паэтычнага твора з мастацкага пункта гледжання ўбаку, пачаўшы групаваць, класіфікаваць, вымяраць яго, імкнучыся да ўяўнай аб'ектыўнасці і максімальнай дакладнасці сваіх меркаванняў і вывадаў, апошнія будуць супярэчыць прыродзе крытычнага выказвання, бо не будуць здольнымі ўзнавіць паэтычны голас, перадаць непаўторную атмасферу твора, не змогуць патлумачыць яго эстэтычна-духоўныя вартасці і мастацкія каштоўнасці.

Трэба таксама адзначыць, што суб'ектывізм у крытыцы (калі яна пазбаўлена тэндэнцыйнасці і не служыць мэтам ідэалагічнай прапаганды) не мае нічога агульнага з небесстароннасцю, прадузятасцю, хоць часта менавіта так і разумеецца. Кожны можа любіць або не любіць той ці іншы твор, аднак крытык тым адрозніваецца ад звычайнага чытача, што павінен заўсёды тлумачыць сваю ацэнку кожнага тэксту. «Абсалютызацыя аб'ектыўнага пачатку крытычнага аналізу, перабольшванне непахіснасці і нязменнасці аб'ектыўнага сэнсу твора прыводзяць да ілюзіі магчымасці стварэння строга дакладных, матэматычна верагодных метадаў вывучэння літаратурнага твора. Пры такім падыходзе выпускаецца з-пад увагі гуманітарны характар літаратурна-крытычных і літаратуразнаўчых меркаванняў і роля ў іх асобаснага пачатку інтэрпрэтатара. Абсалютызацыя аб'ектыўнасці крытыкі ігнаруе гістарычна абумоўлены яе характар, гістарычную зменлівасць яе меркаванняў. <...> Менавіта дыялектыка аб'ектыўных і суб'ектыўных пачаткаў і абумоўлівае суб'ектыўна-аб'ектыўны, устойліва-зменлівы, інварыянтна-варыятыўны, "дакладна"-шматзначны характар прачытання і ацэнкі твора літаратурна-мастацкай крытыкай. Таму толькі спалучэнне ўсяго рацыянальнага ў "дакладных" і "гуманітарных" метадах і можа забяспечыць усёабдымны цэласны аналіз мастацкага твора, аналіз, які будзе адпавядаць задачам, прызначэнню і самой прыродзе літаратурнай крытыкі»[1] [1, с. 4–5].

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Борев ЮБ. Методология анализа художественного произведения. В: Борев ЮБ, редактор. *Методология анализа литературного процесса*. Москва: Наука; 1989. с. 3–32.

## References

1. Borev YuB. [Methodology of analysis of the work of fiction]. In: Borev YuB, editor. *Metodologiya analiza literaturnogo protsessa* [Methodology of analysis of the literary process]. Moscow: Nauka; 1989. p. 3–32. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 25.03.2019.*
*Received by editorial board 25.03.2019.*

[1]Пераклад наш. – *А. К.*